Імя кампазітара, народнага артыста Рэспублікі Беларусь (1999), заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1994) Э.Б. Зарыцкага добра вядома прыхільнікам беларускай эстрады ў нашай краіне. Living Рознабаковы творца, ён мае шырокае прызнанне як кампазітар-песеннік. Э. Зарыцкаму ўдалося напісаць больш за 500 песень, многія з якіх палюбіліся слухачам.

Нарадзіўся будучы кампазітар у г. Красны Кут Саратаўскай вобласці. Скончыў музычную школу ў Мінску. Усур’ёз займацца песняй пачаў у музычным вучылішчы, але, паступіўшы ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю на аддзяленне кампазіцыі да народнага артыста Беларусі А. Багатырова, стаў старанна складаць кантаты і араторыі. Эдуардам Зарыцкім напісана шмат музыкі ў розных жанрах: сімфонія (1970), сюіта (1980), канцэрціна “Пастараль” для сімфанічнага аркестра (1977), канцэрты для габоя з аркестрам (1973) і валторны з аркестрам (1974), Капрычыа для фартэпіяна з аркестрам (1978), сюіта на тэмы беларускіх народных песень для народнага аркестра (1976) і інш. З апошніх прац – аперэта “Белыя росы”, лібрэта да якой напісаў А. Дудараў.

Песня заўсёды была з Э. Зарыцкім. У маладосці лёс звёў яго з беларускім КВЗ (клубам вясёлых і знаходлівых), для ўсіх перадач якога малады кампазітар пісаў музыку. Пасля заканчэння ў 1970 г. кансерваторыі Э. Зарыцкі быў прызваны ў армію і адначасова стаў членам Саюза кампазітараў. Пасля арміі ён працаваў у Тэатры юнага гледача на пасадзе дырыжора і загадчыка музычнай часткі. Зрабіў вялікую колькасць аранжыровак да пастаўленага ў гэтым тэатры мюзікла “Вестсайдская гісторыя”. Напісаў музыку да музычнага спектакля “Снежная каралева”, пастаўленага ў Беларускім тэатры імя Янкі Купалы, да маскоўскай пастаноўкі п’есы А. Макаёнка “Трыбунал”, пісаў музыку для кіно і мультфільмаў. Па радыё загучалі песні кампазітара. Сёння музычную культуру нашай краіны немагчыма ўявіць без песень “Я вернусь”, “Листок календаря”, “Прощальная гастроль”, “Ночные костры”, “Замова”, “Не хадзі, казача”, “Поцелуй”, “Зорачка”, “Твае вочы – азёры” і шматлікіх іншых. У сваёй шматгадовай творчасці прыярытэт пісьменнік аддаваў песні – лірычнай, добрай, светлай. Але не адмаўляўся ён і ад песень грамадзянскага гучання.

У песню кампазітар стараецца прынесці элемент вытанчанасці, таму і кажуць пра яго: майстар арыстакратычнага шлягера. А адсюль і патрабавальнасць да вершаў. Э. Зарыцкі імкнецца працаваць з сур’ёзнымі паэтамі. Сярод аўтараў яго песень – Р. Барадулін, Л. Дранько-Майсюк, Г. Бураўкін, Н. Гілевіч, У. Карызна… Апошнім часам кампазітар вельмі плённа супрацоўнічае з калектывам Дзяржаўнага канцэртнага аркестра на чале з народным артыстам Беларусі М. Фінбергам. Да 200-годдзя з дня нараджэння А. Міцкевіча ён стварыў для гэтага аркестра цыкл на вершы паэта “Адкажы, родны Нёман”. У выкананні аркестра прагучалі і песні Э. Зарыцкага на вершы Я. Купалы, вакальныя цыклы на вершы Я. Коласа “Край ясназоры” і У. Караткевіча “Зямля дзядоў”. Шмат напісаў кампазітар і для Анталогіі беларускай паэзіі і песні, у якой будуць прадстаўлены песні на вершы беларускіх паэтаў, пачынаючы з XVI ст. Песня Э. Зарыцкага “Так пришла к нам Победа” штогод гучыць над плошчай Перамогі ў Мінску 9 мая.